

# «...ВЕРШЫ Ў АЛЬБОМ І ДРУГІЯ НАПІШУЦЬ»

## Аб чым народны паэт Броўка пісаў першаму сакратару Машэраву

**У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца ліст народнага паэта да Пятра Міронавіча Машэрава ад 9 кастрычніка 1968 года. Пятрусь Броўка адпачывае ў Сочы. Стан здароўя далёка не лепшы. Можна засяродзіцца на сабе, у лепшым выпадку працягнуць галоўную справу свайго жыцця — пісаць вершы. Альбо проста любавацца хараством узбярэжжа Чорнага мора... Але пісьменнік знаходзіць час і выкладае некаторыя свае думкі Першаму сакратару ЦК Кампартыі Беларусі...**

*«Дарагі Пётр Міронавіч!*

*Я ўсё пад уражаннем харошае, цікавае размовы з Вамі ў мінулым месяцы. Але, як заўсёды, хочацца сказаць многа, а не паспяваеш. А пасля думаецца, а чаму я не сказаў пра гэта і пра гэта... Ды, відаць, такая яна і старыкоўская ўласцівасць, калі хочацца пагаварыць больш падрабязна аб усім. Вось і я, карыстаючыся тым, што ў Сочы ў мяне часу многа, на танцы і гулі хадзіць мне позна, хачу адарваць у Вас крыху часу, каб паслухалі пра мае роздумы і развагі.*

не «Народны паэт БССР». Быў узнагароджаны і трыма ордэнамі Леніна... У 1948—1967 гг. Пятрусь Броўка — старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР...

З пісьма Машэраву: «...*Надыходзіць свята пяцідзесяцігоддзя рэспублікі. А яно мяне вельмі хвалюе. Можа, асабліва яшчэ і таму, што ўсе пяцьдзясят год прайшлі на маіх вачах. І пяцьдзясят год працы ў мяне. У снежні 1918 года трынаццацігадовым хлапчуком я пачаў працаваць перапісчыкам Вяліка-Далецкага ва-куток мой на Вушаччыне. Але калі пабачыў на высокім узгор'і над люстраным возерам высозны абеліск, прыбраны кветкамі, з імёнамі загінуўшых герояў, з імёнамі тых, з кім некалі рос і дзяліў лусту чорнага хлеба, на вочы набеглі слёзы...*»

Тут, пэўна, аўтарытэтны пісьменнік меў на ўвазе і гістарычную памяць, звязаную з грамадзянскай вайною, падзеямі Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі?.. У 1960-я гады гэтая тэма, зразумела, і хвалявала, і адлюстраванне яе ў мастацкіх творах было прыкметным... Варта згадаць кнігу «Рудабельская рэспубліка» Сяргея Грахоўскага!.. А яшчэ ж раней былі створаны «Партызаны» Кандрата Крапівы. У 1960-я гады згадалі і Васіля Гарбацэвіча і яго п'есу, створаную яшчэ ў 1920-я, — «Чырвоныя кветкі Беларусі». Нават самадзейныя тэатры пачалі яе актыўна ставіць на клубных сцэнах.

*...узняло актыўнасць у будаўніцтве нашай моладзі...*»

Варта ўспомніць, што і ў самым пачатку сваёй творчасці Пятрусь Броўка вялікую вагу ўдзяляў ролі мастацкага слова ў грамадскай справе: «Мне трэба, каб слова // падносіла цэглу, // а вершы ў альбом // і другія напішуць...» Таму і ў лісце ў ЦК клопаты паэта пра рабочага чалавека падаюцца цалкам натуральнымі, лагічнымі, яны вынікаюць і з мастацкай пазіцыі пісьменніка.

Чытаем далей: «*Пётр Міронавіч! Паколькі я пачаў гаварыць пра моладзь, дазвольце мне пагаварыць і аб нашым камсамоле. Я ведаю, што Вы значна больш ведаеце аб жыцці нашай моладзі. Доўгі час Вы былі першым сакратаром ЦК ЛКСМБ. Можа, тое, што прапаную я, сёння і неапраўдана. Можа, я прымерваюся на сябе, камсамольца дваццатых гадоў, і на сваіх сяброў. А ў сучаснай моладзі другія інтарэсы. Але я не ма-*

Пятрусь Броўка сам па жыцці ўяўляў цэльную асобу, не губляў ніколі настойлівасці, разважлівасці, якія дазвалялі адолець многія мэты...

*Ісці да мэты — устаць да ўсходу*
*І даць зямлю адчуць нагам,*
*Ды, крышачы сцяну нягоды,*
*Ісці насуперак вятрам.*

*Няхай палохаюць віхуры,*
*Ты не мяняй кірунак свой,*
*Бо нават птушкі супраць буры*
*Сядзяць наперад галавой.*

З ліста Машэраву: «...*Добра, што пачалі па радыё больш часта перадаваць рэвалюцыйныя песні, песні старых рэвалюцыянераў. Як яны ўздымаюць рэвалюцыйны дух! І, можа, варта было б падкарэкціць па радыё і тэлебачанні ўсялякую псеўдалюбоўную лірыку, пустату, што толькі размагнічвае душы маладых. І, канечне, як можна менш заходняй «адсябяціны», якая калечыць наша юнацтва.*

*...першага класа, як толькі дзіця пераступіць парог, трэба яго выхоўваць у любові да Айчыны, да роднае прыроды. Скажам так:*

*— Дзеці, вы жывяце ў рэспубліцы, за якую аддалі сваё жыццё яе лепшыя людзі, у рэспубліцы, якую стварыў вялікі Ленін. Шмат перанесла яна гора, але вось якая яна магутная і прыгожая. Палі і лясы, рэкі і азёры, гаі і дубравы, нават маленькія ручайкі — усё гэта ваша. Усё гэта трэба шанаваць і берагчы. Не можна ламаць і нішчыць, гэта ж вельмі шкодна... Ды што я спрабую навучаць, настаўнікі самі ведаюць, як гэта рабіць і лепш, але рабіць гэта трэба абавязкова. А, як відаць, не ўсюды яно робіцца*».

У нечым наіўныя для сённяшняга часу прыклады не пазбаўляюць грунтоўнасці высноў, якія, пагадзіцеся актуальныя і цяпер. Пятрусь Броўка ўважліва назіраў за жыццём. І ні на хвіліну не хаваўся ў сваёй «мастацкай шкарлупіне»...

З ліста народнага паэта: «*Вось...*

У такіх клопатах — відавочная праява грамадзянскага стаўлення да навакольнага жыцця. І яшчэ — у малым, у з'явах не надта кідкіх, на першы погляд, пісьменнік паказвае сваё ўменне падкрэсліць сацыяльна значныя праблемы. Такі ўважлівы погляд на жыццё, безумоўна, сілкаваў і саму мастацкую творчасць Петруся Броўкі. Сёння, як правіла, такіх назіранняў ад пісьменніка ні ў яго творах, ні ў яго публіцыстычных выступленнях наўрад ці дачакаешся...

«*Пётр Міронавіч! Вельмі я ўжо загаварыўся*, — піша народны паэт, — *але хацелася ж унесці яшчэ адну прапанову. Добра і вельмі добра, што мы ўстанаўляем помнікі і абеліскі памяці герояў, што ёсць у нас кнігі народнай славы. А чаму б не ажыццявіць яшчэ адну справу. Чаму б на спецыяльных стэндах у калгасных клубах, у дамах сацкультуры не выстаўляць фотапартрэтаў загінуўшых герояў з кароткімі даведкамі іх гераізму. Такія*

**З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы**